

# 9-га МАЯ — ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ.

# СА СВЯТАМ, ТАВАРЫШЫ!




ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 16 (255) | Субота, 7 мая 1977 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## СЛАВІМ ПОДЗВІГ НЕЎМІРУЧЫ

Савецкія людзі, усё прагрэсіўнае чалавецтва ўрачыста адзначылі Першамай, а пасьлязаўтра, 9 мая, яны сустрэнуць яшчэ больш радаснае свята — Дзень перамогі, свята вялікай гордасці за нашу краіну, яе гераічны народ. 9-га мая 1945 года доўгая, крывавая барацьба супраць фашызму закончылася вялікай перамогай міралюбівых сіл. Рашаючы ўклад у гэту перамогу ўнёс савецкі народ.

Трыумфальным маршам прайшлі гітлераўскія полчышчы па краінах Еўропы, і толькі на савецкай зямлі яны сустрэлі грозную непераможную сілу. Камуністычная партыя натхніла і арганізавала савецкі народ, яго Ўзброеныя сілы на свяшчэнную вайну з захопнікамі. Барацьба з самага пачатку набыла выключна востры характар і ўсе 1418 дзён Вялікай Айчыннай вайны не слабела яе бязлітаснасць і напружанне. Час не згладзіць у памяці народаў вялікія бітвы пад Масквой, Сталінградам, Курскам, у Беларусі і на Украіне, у Польшчы, у краінах Паўднёва-Усходняй Еўропы, на тэрыторыі самой фашысцкай Германіі, дзе буйнейшай бітвай другой сусветнай вайны з'явілася бітва за Берлін.

Вайна запатрабавала ад савецкага народа вялізнага напружання сіл як на фронце, так і ў тыле. Яна стала праверкай трываласці і жыццяздольнасці сацыялістычнага грамадскага ладу, народжанага Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыяй. І першая ў свеце сацыялістычная дзяржава выстаяла і змагла знішчыць ворага. Перамога над фашысцкай Германіяй аказала вялікае ўздзеянне на ўвесь ход сусветнага развіцця. Яна прывяла да ўмацаванню сіл міру і сацыялізму. І зараз у авангардзе барацьбы ідзе савецкі народ, ленінская Камуністычная партыя.

Савецкія людзі схіляюць галовы перад памяццю герояў, якія аддалі сваё жыццё за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы, светлае і радаснае свята Перамогі адзначаюць яны гераічным працоўным подзвігам у імя будаўніцтва камунізму.

Многа ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, былых партызанаў і падпольшчыкаў працуе ў нашым універсітэце. Яны ўнеслі свой уклад у перамогу над ворагам, і мы выказваем ім шчырую ўдзячнасць за светлае і радаснае жыццё, якое абаронцы Радзімы змаглі адстаяць у крывавых бітвах. Іх вялікі подзвіг неўміручы, ён будзе жыць у вяках!

### СЁННЯ ЎРАЧЫСТЫ ВЕЧАР

Сёння ў актавай зале ўніверсітэта адбудзецца ўрачысты вечар, прысвечаны Дню Перамогі. У праграме — урачыстая частка, святочны канцэрт. Пачатак — у 18 гадзін.

## ПАД ПЕРШАМАЙСКІМІ СЦЯГАМІ

Урачыста, з радасным настроем шматтысячны калектыў нашага ўніверсітэта адзначыў Першамайскае свята. 30-га красавіка ў актавай зале адбыўся вечар, прысвечаны Міжнароднаму дню салідарнасці працоўных свету, з дакладам на якім выступіў намеснік сакратара парткома, загадчык кафедры эканомікі працы, дацэнт У. Д. Арэшчанка.

Начальнік аддзела кадраў П. А. Савінскі зачытаў загад, у якім рэктар універсітэта Б. В. Бокуць павіншаваў выкладчыкаў, студэнтаў, рабочых і служачых ГДУ са святам і лепшым з іх аб'явіў падзяку.

Урачысты вечар закончыўся вялікім святочным канцэртам, у якім прынялі ўдзел самадзейныя артысты ўніверсітэта.

Выдатным выдаўся Першамайскі дзень. Гэта яшчэ больш узняло святочны настрой. Як і многія тысячы гамяльчан, выкладчыкі і студэнты ўніверсітэта пад першамайскімі сцягамі прайшлі ў маляўнічай калоне на цэнтральнай плошчы горада, якая носіць імя Уладзіміра Ільіча Леніна. У час маніфестацыі працоўныя ардэнаноснага Гомеля рапартавалі аб сваіх працоўных дасягненнях на вахце 60 ўдарных тыдняў у гонар знамянальнага юбілею Савецкай улады. Было аб чым сказаць і калектыву нашага ўніверсітэта. Першамайскае свята ён сустрэў новымі дасягненнямі ва ўсіх сваіх справах. Выкладчыкі і студэнты, як і ўсе савецкія людзі, яшчэ раз прадэманстравалі сваю адданасць ідэям вялікага Леніна, згуртаванасць вакол Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада.

**На здымках:** 1. Па цэнтральнай плошчы імя У. І. Леніна крочаць сцяганосцы — фізкультурнікі ўніверсітэта. 2. У калоне ГДУ — ветэраны вайны і працы.

Фота **В. Садоўскага.**





## НА ПАСЯДЖЭННІ САВЕТА КАФЕДР ГРАМАДСКІХ НАВУК

Чацвёртага мая адбылося пасяджэнне Савета кафедр грамадскіх навук. Іх загадчыкі выступілі з інфармацыяй аб укараненні ў вучэбны працэс рэкамендацый Усесаюзнай нарады загадчыкаў кафедр грамадскіх навук.

Старшы выкладчык кафедры навуковага камунізму В. М. Курбатаў выступіў з паведамленнем аб ходзе падрыхтоўкі да VII агляду-конкурсу студэнцкіх навуковых работ.

Прарэктар па навуковай рабоце М. В. Навучыцель сваё выступленне прысвяціў пытанню правядзення міжвузаўскай канферэнцыі, прысвечанай 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Аб задачах кафедр грамадскіх навук універсітэта па забеспячэнню іх вядучай ролі сярод кафедр грамадскіх навук у ВНУ горада і вобласці на пасяджэнні Савета гаварыў рэктар Б. В. Бокуць.

Па дакладу сакратара парткома У. В. Казлова зацверджана камісія па праверцы ідэйна-метадычнага ўзроўню выкладання прыродазнаўчых дысцыплін на кафедрах ГДУ.

# У БІТВАХ АЙЧЫНУ СВАЮ АДСТАЯЛІ

## БЯСПРЫКЛАДНЫ ГЕРАІЗМ

**Мікалай Мікалаевіч Маёраў — прадстаўнік праслаўленага Чарнаморскага флоту, у часцях якога яму давялося ўдзельнічаць у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пасля вайны да 1956 года М. М. Маёраў працаваў выкладчыкам вышэйшых ваенных навучальных устаноў.**



Фота 1947 года.

Святкаванне Дня Перамогі ў год 60-годдзя Кастрычніка надае яму асаблівую вялікасць. У вайне перамог створаны Кастрычнікам наш грамадскі і дзяржаўны лад, нашы слаўныя Узброеныя Сілы. У сваю чаргу разгром фашызму і японскага мілітарызму ў ходзе другой сусветнай вайны, перамога сацыялістычных рэвалюцый у радзе краін Еўропы і Азіі паскорыла сусветнае развіццё. Рэвалюцыйны працэс, пачаты Вялікім Кастрычнікам, дасягнуў якасна новага рубяжа: сфарміравалася сусветная сістэма сацыялізму, адбылося карэннае змяненне суадносін сіл на сусветнай арэне ў карысць сацыялізму.

Свой уклад у перамогу Савецкіх Узброеных Сіл над ворагам унёс і Чырвонасцяжны Чарнаморскі флот, у саставе часцей якога мне давялося ўдзельнічаць у Вялікай Айчыннай вайне з першых да апошніх яе дзён. Чарнаморскі флот быў асабліва многанацыянальным па свайму саставу. І ў яго гераічнай барацьбе ярка праявілася народжаная Кастрычнікам дружба савецкага народа.

Абарона Адэсы і Севастопаля, Керчы і Новарасійска, вызваленне гэтых гарадоў-герояў, дэсанты і барацьба чарнаморцаў на «Малой зямлі» пад Новарасійскам і Керчу, Эльцігенам і Феадосіяй увайшлі адной з самых яркіх старонак у летапіс Вялікай Айчыннай вайны. Іменна ў час абароны Адэсы і Севастопаля нарадзіўся ў нашых Узброеных Сілах дэвіз: «Трымацца так, як трымаюцца маракі».

Баявыя заслугі Чарнаморскага флоту высока ацэнены КПСС і Савецкім урадам. З дзесяці гарадоў-герояў чатыры — гарады Чарнамор'я.

Мінулі дзесяцігоддзі, сціраюцца ў памяці асобныя эпізоды вайны, але ніколі не забыць тых, хто аддаў жыццё ў імя абароны Радзімы. Цяжка перажывалася і разбурэнне прычарнаморскіх гарадоў, сёл, прадпрыемстваў. Але пасля вайны прайшло некалькі гадоў, і мы ўбачылі іх адбудаванымі, яшчэ больш прыгожымі. Здзейсніўшы бяспрыкладны подзвіг у гады Вялікай Айчыннай вайны, савецкі народ прадэманстраваў масавы гераізм у мірнай працы па аднаўленню разбураных гарадоў і сёл, фабрык і заводаў, па стварэнню грамадства развітага сацыялізму.

**М. МАЁРАЎ,**
**загадчык кафедры паліт-эканоміі, капітан 2-га ранга запасу.**

**Вялікі ўклад у перамогу над нямецка-фашысцкімі захопнікамі ўнеслі народныя мсціўцы. У гады вайны смелым партызанам зарэкамендаваў сябе Яўген Антонавіч Семянчук — адзін з членаў мужнай партызанскай сям'і. Цяпер Я. А. Семянчук — дацэнт кафедры гісторыі КПСС.**



## З ПАРТЫЗАНСКАЙ СЯМ'І

Яўген Антонавіч Семянчук нарадзіўся і вырас у невялікай вёсцы Паршчаха, што ў Глускім раёне Магілёўскай вобласці. Тут яго і застала Вялікая Айчынная вайна.

Ужо з першых дзён фашысцкай акупацыі сям'я Семенчука праяўляла смеласць і рашучасць, аказвала дапамогу параненым савецкім воінам, паказвала часцям Чырвонай Арміі найбольш небяспечныя напрамкі для адыходу з варожага акружэння. За ўдзел у пераправе праз рэчку Пціч камандзір дывізіі падзякаваў бацьку Яўгена Антонавіча — Антона Вікенцьевіча — і ўзнагародзіў яго асабістай зброяй, даў каня.

Вялікая любоў да Радзімы і нянавісць да лютага ворага неўзабаве прывялі ў партызанскі атрад імя Варашылава ўсю сям'ю Семенчука. Бацька і маці выконвалі заданні камандавання па арганізацыі агентурнай разведкі, старэйшы брат Мікалай (цяпер дырэктар Гомельскага чыгуначнага тэхнікума) вызначаўся як адважны кулямётчык і камандзір падрыўной групы, а Яўген і яго сястра Антаніна былі байцамі партызанскага атрада і сувязнымі разведкі.

Разам з усімі народнымі мсціўцамі Яўген Антонавіч удзельнічаў у баявых аперацыях і паходах атрада. У сутычцы з гітлераўцамі на торфазаводзе «Татарка» ён атрымаў цяжкае раненне. Становішча было вельмі складаным. Для выратавання жыцця юнага партызана камандаванне настаяла на тым, каб ён ехаў у бабруйскую бальніцу.

Не прайшло і тыдня, як фашысты даведаліся аб лячэнні партызана. Ён аказаўся ў варожых руках. Над народным мсціўцам павісла смяротная пагроза. Аднак супраць яго прамых улік фашысты не мелі. Тым не менш на допыце Яўгену Антонавічу давялося вытрымаць суровы паядынак. Калі яго адпусцілі, ноччу ён скрытна перабраўся з бальніцы на нелегальную кватэру. Адтуль дарога зноў прывяла ў партызанскі атрад.

Сябры па зброі хваляваліся за камсамольца. Пры з'яўленні яго ў атрадзе моцна абдымалі са словамі: «Жэнька, ты жывы! Чулі, як шпікі шнырылі па тваймy партызанскаму следу...»

Гэтая радасць сустрэчы хутка была азмрочана страшнай весткай. У люты студзенькі мароз карнікі выгналі з хат вёскі Паршчаха састарэлых людзей, жанчын, дзяцей. На калгасным двары яны дапытваліся ў вязняў, дзе знаходзяцца партызаны. За ўсім гэтым з укрыцця назіраў бацька Антона Яўгенавіча — Яўген Вікенцьевіч, які не вытрымаў такіх здзекаў над аднавяскоўцамі і вырашыў самаахвяраваннем выратаваць іх жыццё! Ён прыйшоў на калгасны двор і кінуў фашыстам кліч: «Я сам прыйшоў. Я ненавіжу вас, людаеды! Разам са сваімі сынамі я змагаюся супраць вас з першых дзён вайны. Больш ніхто з гэтай вёскі не ваяваў супраць вас... Бярыце мяне, я ваш працiўнік, а вы мае заклятыя ворагі. Я перад вамі» (В. К. Якавенка. «На акупіраванай зямлі», с. 135).

Такім чынам ні ў чым не павінных людзей выратаваць не ўдалося. Карнікі загналі ў цялятнік 72 чалавекі, аблілі будынак бензінам і запалілі яго. Антона Вікенцьевіча і яго жонку кінулі ў агонь жывымі асобна.

Цяжкая страта ўскалыхнула ўсіх партызан. Моцна абняўшыся і сціснуўшы зубы, маўкліва сталі ля сасны Мікалай, Яўген і Антаніна Семенчукі. Да іх падыйшоў камісар атрада і пабацькоўску прытуліў да сябе: «Мацуйцеся, не падайце духам, рабяты. Цяпер бацькам вашым будзе ўвесь партызанскі атрад, маці — вялікая непераможная Радзіма. Мы адпомсцім фашыстам!»

Партызанскае слова было моцным. На беларускай зямлі фашысты і прыхвасні не ведалі пакою ні днём, ні ноччу, ад народных мсціўцаў яны неслі вялікія страты, пакуль не былі разбіты ўшчэнт.

**І. ІЛЬІНЫХ,**
**дацэнт кафедры гісторыі КПСС.**

## ПА ЗАКЛІКУ СЭРЦА

**Усяму свету вядомы бяспрыкладны подзвіг камсамольца Аляксандра Матросава. Добра ведае Героя, вучыўся з ім і ўдзельнічаў у баі за вёску Чарнушкі, дзе быў здзейснены гераічны ўчынак, Уладзімір Сцяпанавіч Сідараў.**



Даўно адгрымелі гарматы, адшугалі пажары вайны. Радзіма залячыла свае цяжкія раны, стала яшчэ больш заможнай і магутнай. Але нам ніколі не забыць тых суровых дзён, калі савецкім людзям давялося вытрымаць у кровапралітнай барацьбе непамернае выпрабаванне. Асаблівы сэнс яно мела для тых, хто нарадзіўся пасля Вялікага Кастрычніка, выхоўваўся пры Савецкай уладзе. Гэта было выпрабаванне моладзі новага складу, светлыя імкненні і крылатыя мары якой нечакана абарвалі гітлераўскія каты.

Ужо з першых дзён вайны савецкая моладзь праявіла ўсе свае найлепшыя якасці. Разам са старэйшымі пакаленнямі яна смела ўзнялася на абарону сацыялістычнай Айчыны. Адстаяць яе незалежнасць, не шкадуючы крыві і жыцця, — гэта думка натхняла не толькі кадравых воінаў, але і тых, хто прасіўся на фронт добраахвотнікам. Тысячы і тысячы юнакоў і дзяўчат суткамі не адыходзілі ад дзвярэй ваенкаматаў, паўтараючы адны і тыя ж словы: «Хачу на фронт».

Па ўзросту не бралі на фронт і мяне. У спадзяванні, што маю просьбу ўсё-такі задаволяць, я пакінуў родную Віцебшчыну і падаўся на Усход. Неўзабаве прыбыў у сталіцу нашай Радзімы — Маскву. І хоць вораг з кожным днём набліжаўся да яе ваколіц, адчувалася, што масквічы, усе савецкія людзі не падалі духам. Яны верылі ў нашу перамогу, якой бы дарагой цаной яна не дасталася.

Не задаволілі маёй просьбы і ў маскоўскім ваенкамаце. Да паўналецця мне не хапала некалькіх месяцаў, і я вымушаны быў адправіцца ў Башкірыю, дзе пэўны час працаваў машыністам электрастанцыі. Гэта былі дні, калі Краіна Саветаў знаходзілася ў выключнай небяспецы. Таму нельга было заставацца спакойным. Зноў прашуся на фронт. На радасць, просьбу маю, нарэшце, задаволілі.

Маё воінскае жыццё пачалося з Краснахолмскага ваеннапяхотнага вучылішча. Тут было шмат маіх равеснікаў. Вучыўся на камандзіра і Саша Матросаў. Калі спатрэбілася, не закончыўшы курс навучання, ён у ліку першых выказаўся добраахвотна адправіцца на фронт. Я таксама імкнуўся біць ворага, які спапяліў нашу родную беларускую зямлю, страшэнна здзекваўся над яе народам.

Наш першы бой быў за вядомую ўсяму свету вёску Чарнушкі, дзе здзейсніў свой неўміручы подзвіг Аляксандр Матросаў. Гэты подзвіг стаў сімвалам бясстрашша, мужнасці і адвагі ўсяго савецкага народа.

Па дарогах вайны мне давялося прайсці не адну сотню кіламетраў, пакуль цяжкія раны незадоўга да Перамогі канчаткова не вывялі са строю.

...Непрыкметна бягуць гады мірнай стваральнай працы. Даўно нас завуць ветэранамі, на сустрэчы запрашаюць піянеры і камсамольцы. Яны жыва цікавяцца ўсімі падзеямі суровых ваенных гадоў. Часцей за ўсё мне даводзіцца расказваць пра Аляксандра Матросава, жыццё і геройскі подзвіг якога добра вядомы ўсім рабятам. І кожны раз іх вочы свецяцца няскрытнай добрай зайздрасцю. Ад гэтага ствараецца адчуванне, што наша выдатная савецкая моладзь у любы момант гатова на такі ж подзвіг, які роўна ў 18 гадоў жыцця здзейсніў камсамолец Аляксандр Матросаў.

**У. СІДАРАЎ,**
**дацэнт кафедры філасофіі.**

## У БРАЦКІМ САЮЗЕ

**32 гады аддаў вайсковай службе Аляксандр Аляксеевіч Косцікаў. Ён — актыўны ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны, памяць аб якой захаваў на ўсё жыццё.**

Сярод моладзі 20-х гадоў асабліва папулярнымі былі ваенныя спецыяльнасці. Растлумачыць гэта проста. Наша першая ў свеце сацыялістычная краіна знаходзілася ў капіталістычным акружэнні. Над ёй заўсёды вісела пагроза ваеннай агрэсіі. Таму многія юнакі гарэлі жаданнем стаць ваеннымі людзьмі, каб у любы момант даць рашучы адпор ворагу.

Я таксама вырашыў стаць афіцэрам Чырвонай Арміі. Паступіў вучыцца ў Растоўскае артвучылішча. Тут і застала мяне Вялікая Айчынная вайна. Баявое хрышчэнне прыняў пры абароне Растова. Затым давялося яшчэ ўдзельнічаць у многіх баявых аперацыях. Ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вызваляў Беларусь, Прыбалтыку. Дарогамі вайны прайшоў па заходняй Еўропе. Камандаваў узводам, быў начальнікам разведкі дывізіёна, камандзірам мінамётнай батарэі.



Усіх баявых эпізодаў не апішаш. Мне хочацца сказаць пра адно: пра той моцны саюз савецкіх народаў, якія сумесна, не шкадуючы жыцця, кавалі перамогу над ненавісным ворагам. У вайсковых падраздзяленнях, якімі мне даводзілася камандаваць, былі рускія і беларусы, украінцы і грузіны, азербайджанцы і армяне, воіны многіх іншых нацыянальнасцей. Не ўсе з іх маглі добра размаўляць на рускай мове. Тым не менш на вайне мы выдатна разумелі адзін другога, хаця і гаварылі па-рознаму. Мы разумелі таварыш таварыша праз адзінае пачуццё помсты гітлераўскім фашыстам, якія прынеслі на савецкую зямлю велізарныя разбурэнні, знішчалі ні ў чым не павінных людзей.

Справядлівасць узяла верх. Вораг пацярпеў сакрушальнае паражэнне. Франтавікі вярнуліся да мірнай стваральнай працы. Многія з іх засталіся працягваць ваенную службу па ахове свяшчэнных рубяжоў нашай Айчыны. Да 1971 года ў часцях Беларускай Чырвонасцяжнай ваеннай акругі служыў і я. Заўсёды было радасна на сэрцы, калі бачыў, што маладыя воіны дастойна працягваюць баявыя традыцыі сваіх бацькоў і дзядоў, настойліва авалодваюць самай сучаснай баявой тэхнікай, каб больш ніколі не дапусціць таго, што перажылі савецкія людзі ў гады мінулай вайны.

**А. КОСЦІКАЎ,**
**падпалкоўнік запасу, лабарант кафедры фізічнага выхавання.**



# НА ВУЧОБУ ЗАПРАШАЕ БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

СТАРОНКА ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

Выключна важнае значэнне, якое надаецца ў нашай краіне развіццю біялагічнай навукі, абумоўлена тым, што яна з'яўляецца вялікай сацыяльнай каштоўнасцю, ад якой у немалой ступені залежыць выкананне народнагаспадарчых планаў. У цяперашні час біялогія, як тэарэтычная аснова медыцыны, сельскай, лясной і паляўнічай гаспадаркі, стала непасрэднай прадукцыйнай сілай. Перад біялагічнай навукай стаіць задача не толькі аптымальнага выкарыстання і ўзнаўлення раслііннага і жывёльнага свету. Яна вырашае і такія пытанні, як пераадоленне несумяшчальнасці тканін, перадача і захаванне спадчыннай інфармацыі, вывучэнне розных груп біялагічна актыўных рэчываў, працэсаў на малекулярным узроўні, кіраванне спадчыннасцю і інш.

Наш факультэт рыхтуе такіх спецыялістаў, якія змогуць вырашаць розныя праблемы біялагічнай навукі. Вучэбна-выхаваўчую і навукова-даследчую работу на факультэце ажыццяўляюць кафедры батанікі і фізіялогіі раслін, заалогіі і дарвінізму, фізіялогіі чалавека і жывёл, хіміі. Педагагічную, навуковую і выхаваўчую работу на біяфаку вядуць вопытныя выкладчыкі, сярод якіх тры дактары біялагічных навук, прафесары, адзін доктар сельскагаспадарчых навук, 18 кандыдатаў навук.

Акрамя агульнатэарэтычных дысцыплін, студэнты факультэта вывучаюць шэраг цікавых курсаў па спецыялізацыях, якія даюць ім грунтоўныя веды па розных галінах біялогіі, больш дэталёва знаёмяць будучых спецыялістаў з жывёльным і раслінным светам Беларусі, Палесся, з праблемамі яго аховы і ўзнаўлення.

На факультэце вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў па наступных спецыялізацыях: батаніка, прамысловае кветкаводства, заалогія з ухілам у паляўніцтвазнаўства. У новым навучальным годзе плануецца адкрыццё спецыялізацый па энтамалогіі і абароне раслін, фізіялогіі чалавека і жывёл з ухілам па фізіялогіі і біяхіміі сельскагаспадарчых жывёл.

З мэтай набыцця будучымі спецыялістамі-біёлагамі навыкаў і прынцыпаў навуковай творчасці, выхавання з іх навуковых супрацоўнікаў і вучоных, студэнты факультэта ўжо з першых гадоў вучобы шырока прыцягваюцца да правядзення навуко-

## ЦІКАВАЯ І ВАЖНАЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

вых даследаванняў па заданнях кафедр. Пры ўсіх кафедрах актыўна працуюць навукова-даследчыя студэнцкія лабараторыі. Іх члены прымаюць удзел у рэспубліканскіх, Усесаюзных конкурсах на лепшую студэнцкую навуковую работу і часта атрымліваюць высокія адзнакі. Шэраг лепшых студэнцкіх работ, у тым ліку і па прыродаахоўчай тэматыцы, якая актыўна распрацоўваецца на факультэце, апублікаваны ў розных навуковых выданнях. Асобныя даследаванні адзначаны прэміямі і граматамі.

Вялікую ролю ў падрыхтоўцы будучых спецыялістаў-біёлагаў адыгрываюць вучэбна-палявыя і вытворчыя практыкі, якія праходзяць на аграбіялагічнай станцыі ў Чонках. Тут студэнты папаўняюць гербарый і экалагічныя калекцыі багатым матэрыялам з маляўнічых месцаў на Дняпры, Прыпяці і іх басейнаў.

Студэнты, якія спецыялізуюцца па фізіялогіі чалавека і жывёл, праходзяць вытворчую практыку ў Інстытуце фізіялогіі АН БССР.

У час практык будучыя біёлагі не толькі знаёмяцца з прыродным, раслінным і жывёльным светам пэўных глебава-кліматычных зон, а вядуць таксама навуковыя даследаванні, збіраюць, калекцыяніруюць і сістэматызуюць матэрыял для сваіх курсавых і дыпломных работ.

Акрамя набыцця сучасных біялагічных ведаў студэнты авалодваюць навыкамі арганізатарскай і грамадска-палітычнай дзейнасці.

Пасля заканчэння вучобы на нашым факультэце маладыя спецыялісты накіроўваюцца на працу ў школы, навукова-даследчыя ўстановы, запаведнікі, заказнікі, на некаторыя прамысловыя прадпрыемствы, у абласныя і раённыя арганізацыі ў якасці паляўніцтвазнаўцаў, у распараджэнне Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі для развядзення прамысловага кветкаводства. Плануецца таксама падрыхтоўка часткі студэнтаў для работы ў лабараторыях па даследаванню якасці кармоў.

Студэнты, якія выдатна займаліся на працягу ўсяго тэрміну вучобы і актыўна ўдзельнічалі ў навукова-даследчай рабоце, працягваюць навучанне ў аспірантуры пры кафедрах батанікі і фізіялогіі раслін, фізіялогіі чалавека і жывёл, заалогіі і дарвінізму. Тыя ж выпускнікі, якія рыхтуюцца для выкладчыцкай работы на факультэце, накіроўваюцца для вучобы ў мэтавую аспірантуру пры Акадэміі навук БССР.

Спадзяемся, што і сёлета на наш факультэт прыйдзе шмат здольных юнакоў і дзяўчат, якія жадаюць набыць цікавую і вельмі неабходную спецыяльнасць біёлага. Мы чакаем моладзь, якая па-сапраўднаму любіць навуку аб жывым і будзе настойліва авалодваць ёй.

**С. АЛЕШКА,**
**дэкан факультэта,**
**дацэнт.**



**НА ЗДЫМКУ:** у лабараторыі біялагічнай хіміі ідуць практычныя заняткі студэнтаў групы Б-22.

Фота **В. Садоўскага.**

## У МАЛЯЎНІЧАЙ МЯСЦІНЕ, З ВЫДАТНЫМІ ТРАДЫЦЫЯМІ

Вучэбны працэс на нашым факультэце заканчваецца вучэбна-палявымі практыкамі, якія студэнты-біёлагі праходзяць на аграбіялагічнай станцыі «Старыя Чонкі», размешчанай у зоне адпачынку гамяльчан. Таго, хто хаця б адзін раз наведаў гэты цудоўны куток прыроды, вабяць да сябе зноў і зноў шумлівы лес з соснамі, дубамі, бярозамі і рака Сож з пушыстымі вербамі па берагах, і луг з мноствам кветак. Уся гэта прыгажосць стварае ў студэнтаў-практыкантаў выдатны настрой, натхняе іх на плённую вучэбную работу.

На аграбіястанцыі створаны ўсе ўмовы для таго, каб будучыя біёлагі з першага ж дня знаходжання ў студэнцкім лагеры маглі актыўна ўдзельнічаць у навукова-даследчай рабоце, таму што біёлаг — гэта перш за ўсё даследчык. Тут кожны знаходзіць сабе справу па душы. На аграбіястанцыі разгортваецца вопытна-селекцыйная работа, і студэнты вывучаюць пытанні ўплыву розных мікраэлементаў на фізіялагічныя працэсы. Па заканчэнню даследаванняў праводзяцца канферэнцыі, на якіх студэнты дакладваюць аб атрыманых выніках.

Як правіла, усе практыканты выконваюць на станцыі вялікі аб'ём работ, папаўняюць свае веды, атрымліваюць пэўныя навыкі і потым паспяхова здаюць залікі.

Нельга не сказаць аб тых выдатных традыцыях, якія склаліся на аграбіястанцыі. Гэта і ўрачыстае адкрыццё студэнцкага лагера з вялікімі музычнымі і спартыўнымі святамі, і дзень «Нептуна», і вечары паэзіі, лекцыі, песні каля кастра. Усё гэта надоўга пакідае ў практыкантаў самыя прыемныя ўспаміны.

**М. БАЙДА,**
**дырэктар аграбіястанцыі.**

## *СЯБРЫ ПРЫРОДЫ*

Як гаварылася ўжо, біялогія — навука аб жывым. Таму біёлагам, бадай, як нікому іншаму блізка прырода. І калі недасведчаным людзям думаецца, што з нашым наваколлем нічога не здарыцца, як бы да яго не адносіліся, дык пазіцыя спецыяліста — зусім праціллеглая. Мы добра ведаем, што да прыроды трэба ставіцца ашчадна, берагчы яе. У адваротным выпадку яна можа строга пакараць чалавецтва. Таму пытанне аховы прыроды для студэнтаў біяфака — адно з самых важных.

Пяць гадоў таму назад на нашым факультэце была створана Дружына па ахове прыроды. Яна стала адной з першых студэнцкіх Дружын сярод усіх ВНУ краіны. Цяпер прыродаахоўчы рух набыў у студэнцкім асяроддзі ўсіх рэспублік шырокі размах. Мы падтрымліваем цесныя кантакты з сябрамі прыроды многіх навучальных устаноў, штогод удзельнічаем ва Усесаюзных канферэнцыях па ахове прыроды, дзе студэнты абменьваюцца вопытам, думкамі па самых разнастайных прыродаахоўчых пытаннях.

Дзейнасць нашай Дружыны даволі разнастайная. Мы вядзём барацьбу з браканьерамі, з усімі тымі, хто наносіць шкоду прыродзе і яе багаццям. Рэгулярна праводзяцца аперацыі «Ёлка», «Бярозавы сок», «Нераст» і інш., мэта якіх не дапускаць самавольнай высечкі ёлак перад Новым годам, падсочкі бяроз з надыходам вясны, вылоўлівання рыбы ў перыяд яе нерасту. Ад членаў Дружыны браканьерам і іншым зламыснікам няма ніякай літасці.

Галоўная ж задача членаў Дружыны — прафілактычная работа. У ходзе яе прадугледжваецца прывіваць людзям і асабліва моладзі вялікую любоў да прыроды і пачуцці ашчадных адносін да яе. Нашы студэнты часта бываюць у школах горада, дзе выступаюць перад вучнямі з гутаркамі на прыродаахоўчыя тэмы, наладжваюць экскурсіі на прыроду, ва ўніверсітэцкі заалагічны музей. Усё гэта, безумоўна, дае свае станоўчыя вынікі, што не можа не радаваць нас. З кожным годам у ваколіцах Гомеля ўсё менш і менш становіцца браканьераў, аматараў пажывіцца свежай рыбкай у забароненны для яе лоўлі час, ужо не так па-варварску высякаюцца да Новага года ёлкі і вясной падсочваюцца бярозы.

У канцы мінулага года ўпершыню члены нашай Дружыны сумесна з гарадскім таварыствам па ахове прыроды і кветкавым магазінам наладзілі выстаўку-продаж навагодніх букетаў, якія выгадна замянялі навагоднія ёлкі.

Хочацца верыць, што моладзь, якая прыйдзе на наш факультэт, ахвотна ўвальецца ў рады Дружыны па ахове прыроды і будзе з карысцю займацца вельмі важнай справай.

**В. КАНДРАЦЕНКА,**
**намеснік камандзіра Дружыны па ахове прыроды,**
**студэнтка IV курса.**

## У АНСАМБЛІ—ТОЛЬКІ ДЗЯЎЧАТЫ

На нашым факультэце займаюцца ў большасці адны дзяўчаты. Але гэта не з'явілася перашкодай для стварэння свайго вакальна-інструментальнага ансамбля. Ён узнік у 1975 годзе. Назву мы яму далі — «Сонейка». Упершыню мы «заявілі» аб сабе, калі выступілі на гарадскім і раённым аглядах-конкурсах мастацкай самадзейнасці. Ансамбль быў узнагароджаны граматамі, якія мы зараз беражліва захоўваем у нашым «архіве». Але ўсё ж такі сапраўдны поспех прыйшоў пазней. Наступны конкурс прынёс нам 3-е месца сярод 22 мужчынскіх самадзейных вакальна-інструментальных ансамбляў.

Непрыкметна праляцелі яшчэ два гады працы і паўсядзённага пошуку сваёй манеры выканання. Гэта быў час напружаных рэпетыцый, шматлікіх паездак з канцэртамі ў Салігорск, Днепрапятроўск, Віцебск.

Зусім нядаўна на міжрэспубліканскім конкурсе вакальна-інструментальных ансамбляў «Сонейка» заняло 1-е месца, атрымала 2 дыпломы і 3 прызы. Усіх нашых дзяўчат — удзельніц ансамбля — гэта вельмі радуе. Сваімі поспехамі мы ў многім абавязаны нашаму мастацкаму кіраўніку Феліксу Круглянскаму.

Атрымаўшы высокае прызнанне сярод студэнцкай моладзі, у музычных колах, мы будзем старацца замацоўваць дасягнутыя поспехі, радаваць нашых слухачоў новымі песнямі.

**І. БАСАВА,**
**удзельніца ансамбля.**

**У вучэбным працэсе на біялагічным факультэце вялікая роля адводзіцца практычным заняткам, якія праходзяць у разнастайных лабараторыях. Будучыя біёлагі праводзяць у іх шмат доследаў.**

**НА ЗДЫМКУ:** студэнтка 1-га курса Н. БЕЛАВУСАВА (на пярэднім плане) за пастаноўкай доследу ў лабараторыі марфалогіі раслін.

Фота **В. Садоўскага.**



# ПЕРШЫ СКАЧОК

**Баявыя традыцыі сваіх бацькоў і дзядоў дастойна працягвае савецкая моладзь. Нямала былых воінаў вучыцца ў нашым універсітэце. Віктар Асіпенка — адзін з іх.**

Колькі дзён у чалавечым жыцці! І кожны прыносіць нешта сваё, непаўторнае, пакідаючы ў памяці мінуты радасці, часам перажыванняў, гора. Але ў любога чалавека ёсць дзень, які яму асабліва дарагі. Такі дзень ёсць і ў мяне...

Здаецца, толькі ў гэтую мінуту ўзлётная паласа імкліва мчалася насустрач. А зараз самалёт падымаецца ўжо вышэй і вышэй. Я з цікавасцю гляджу ў ілюмінатар на зямлю, якая ўсё больш і больш аддаляецца ад мяне і ледзь чутна шапчу: «Ты толькі прымі, родная, ласкава. Упершыню ж прыгаю з парашутам».

Раптам у салон самалёта трапіў сонечны прамень, слізгануў па сціснутых лямкамі грудзях, высек серабрыстае святло з парашутных спражак і знік.

Хацелася думаць аб чымсці іншым, другарадным. Але думкі зноў і зноў вярталіся да скачка, які я павінен быў зрабіць праз некалькі мінут. І зразумела: гэта было маё першае спатканне з небам.

Тады я не ведаў, што парашутызм стане для мяне такім моцным захапленнем і з'явіцца нястрымнае жаданне кідацца з парашутам яшчэ і яшчэ.

Нарэшце павольна, нібыта адцягваючы рашаючы момант, сталі разыходзіцца створкі вялікага люка. У салон самалёта ўварвалася пругкае, напоенае дажджом халоднае паветра. Кожным ударам сэрца адлічвала імгненні перад скачком. З чым можна параўнаць гэтыя апошнія секунды? Хіба толькі з момантам перад залпам гарматы.

Завыла сірэна. Пайшоў, пайшоў, пайшоў... Адзін за другім знікаюць у праёме дэсантнікі. О, сэрца, не стукай у грудзях так моцна! Я адштурхнуўся ад краю люка і сарваўся ў пустату.

Усё замільгала як у шалёным танцы. А правая рука моцна-моцна сціснула алае кальцо. Секунда, яшчэ секунда... Ёсць! Белы купал раскрыўся над галавой. Аглушаны незвычайнасцю таго, што адбылося, я прыціх. Але гэта працягвалася толькі секунды. Радасць ахапіла мяне. Я верыў і не верыў — сон гэта ці ява. Я — парашутыст! Хацелася спяваць, і я прыгадаў словы:

Я с небом навечно
сдружился,
Оно мне открыло мечту.
Я, счастлив, что в небо
влюбился,
Сумел покорить высоту.

Неба! Я палюбіў цябе. Ты клікала мяне ў сваю блакітную даль, было заўсёды ласкавым да мяне. Кожны раз, у момант нашай чарговай сустрэчы шчодра напаўняла мой парашут пругкім паветрам.

Я стаю на зямлі. Каля маіх ног раскінуўся верны памочнік — парашут. Ён быццам просіць: «Сабяры мяне, дэсантнік. Кінь высока ў неба, дай напоўніцца ветрам»..

А ў вышыні гудуць самалёты з чырвонымі зоркамі, успыхваюць купалы парашутаў. Але я не развітваюся з табой, неба. Калі пакліча Радзіма — вярнуся да цябе.

**В. АСІПЕНКА,**
**студэнт 2-га курса эканамічнага факультэта.**

СЕННЯ — ДЗЕНЬ РАДЫЁ

# ВАЖНЕЙШЫ СРОДАК СУВЯЗІ

Савецкі народ заслужана ганарыцца тым, што наша краіна з'яўляецца радзімай радыё — аднаго з важнейшых адкрыццяў чалавецтва.

7-га мая 1895 года рускі вучоны А. С. Папоў на пасяджэнні фізічнага аддзялення Рускага фізіка-хімічнага таварыства ў Пецярбургу прадэманстраваў у дзеянні прыбор — першы ў свеце радыёпрыёмнік. Той гістарычны дзень і з'явіўся днём вынаходніцтва радыё, які цяпер шырока адзначаецца па ўсёй нашай краіне.

З адкрыццём радыё пачала хутка развівацца і ўдасканальвацца радыётэхніка. З цягам часу яна асвоіла перадачу не толькі гукаў, але і адлюстраванняў (тэлебачанне).

Сапраўднага трыумфу дасягнула савецкая радыётэхніка. Аб гэтым пераканаўча сведчыць прыклад яе прымянення ў касмічнай прасторы. Характэрнай з'яўляецца пасадка міжпланетнай станцыі «Венера-4» на планету Венера. На ўсім шляху руху станцыі (300 млн. км) з ёй падтрымлівалася рэгулярная ўстойлівая сувязь. Каб ацаніць гэта дасягненне савецкай радыётэхнікі, дастаткова сказаць, што прыёмнае прыстасаванне наземнага комплексу сувязі з караблём было настолькі адчувальным, што яно здольна вызначыць павышэнне ўзроўню тэмпературы акіяна, выкліканай вылітай у яго шклянкай гарачай вады.

У цяперашні час вучоныя нашай краіны і за рубяжом паспяхова ўдасканальваюць радыёапаратуру ў напрамку яе мікрамініяцюрызацыі, асваення СВЧ частот, інфрачырвоных і аптычных хваль.

Поспехі, дасягнутыя айчыннай мікраэлектронікай у галіне распрацоўкі і асваення прамысловай вытворчасці вялікіх інтэгральных схем з высокім узроўнем інтэграцыі, дазволілі стварыць на адным крышталі элементы логікі і памяці, без якіх не ўяўляецца ні адна электронна-вылічальная машына.

Непасрэднае дачыненне да радыётэхнікі маюць і студэнты фізічнага факультэта, якія спецыялізуюцца па радыёфізіцы і электроніцы. Будучыя спецыялісты з вялікім жаданнем вывучаюць асновы радыёэлектронікі і іншыя дысцыпліны, каб потым з поспехам прымяняць атрыманыя веды на вытворчасці, дзе радыётэхніка і электроніка знаходзіць усё больш шырокае прымяненне.

**М. БАРАНАЎ,**
**выкладчык кафедры радыёфізікі.**

# НАСЦЕНГАЗЕТА

## «ЭКАНАМІСТ» ЗНОЎ ЛЕПШАЯ

Па традыцыі да Дня друку — 5-га мая ў фае вучэбнага корпуса № 1 былі развешаны газеты факультэтаў універсітэта. Журы ў саставе старшыні мясцкома А. В. Саннікавай, сакратара камітэта камсамола М. І. Кузьменкі, старшыні прафкома Н. І. Колтышавай і члена парткома, рэдактара шматтыражнай газеты «Гомельскі універсітэт» У. П. Балогі падвялі вынікі агляду-конкурсу на лепшую насценную газету. Чацвёрты год запар першае месца прысуджана насценгазеце «Эканаміст». Яе рэдкалегія ўдастоена Ганаровай граматы парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, мясцкома і прафкома, а таксама памятнага прыза. Ганаровымі граматамі і прызамі адзначаны таксама насценгазеты «Праметэй» гісторыка-філалагічнага факультэта і «Архімед» фізічнага факультэта, якія занялі адпаведна другое і трэцяе месца.

Журы адзначыла, што за апошні час значна палепшыліся па зместу і мастацкаму афармленню насценныя газеты геалагічнага, механіка-матэматычнага факультэтаў і факультэта фізічнага выхавання.

У сувязі з Днём друку загадам рэктара за актыўны ўдзел у выпуску шматтыражнай газеты «Гомельскі ўніверсітэт» і насценных газет факультэтаў аб'яўлена падзяка дацэнту кафедры паліэканоміі У. Ц. Смірнову і рэдактару насценнай газеты «Эканаміст» Надзеждзе Рагоўскай, якія ўзнагароджаны таксама Ганаровымі граматамі. Студэнтам гісторыка-філалагічнага факультэта Алегу Шведаву, Галіне Карнач, студэнту эканамічнага факультэта Віктару Асіпенку аб'яўлены падзякі з уручэннем грашовых прэмій. Рэдактарам насценгазет «Праметэй» і «Архімед» Анатолю Атрошчанку і Генадзю Ліпскаму, студэнтам Анатолю Зэкаву з гісторыка-філалагічнага факультэта і Людміле Дубко з біяфака аб'яўлена падзяка.

Рэдакцыя нашай шматтыражнай газеты горача віншуе заахвочаных таварышаў і жадае ім яшчэ больш плённага супрацоўніцтва ў перыядычным і насценным друку.




**На здымку:** члены рэдкалегіі насценгазеты «Эканаміст».
Фота **В. Садоўскага.**

*Гумарэска*

# РАЗМОВА Ў ТРАЛЕЙБУСЕ

**(НА МЕСЦЫ ТЫХ, АБ КІМ ПОЙДЗЕ ГАВОРКА, МАГЛІ АКАЗАЦЦА І СТУДЭНТЫ ГРУПЫ Б-24).**

На прыпынку ў тралейбус увайшлі двое. Відаць, студэнты. Яны вялі паміж сабой ажыўленую гаворку.

— Ведаеш, «Песняры» ў Гомель прыехалі. Кажуць, што ў Палацы культуры будаўнікоў выступаць будуць, — сказаў адзін.

— Вось бы паслухаць, — як запаветную мару, выказаў сваё жаданне другі.

— Дзе там! — махнуў рукой першы. — Зноў прафорг скажа, што на групу білетаў не хапіла.

— І заўсёды так, — падтрымаў яго сябар. — Як што якое, дык...

Ён не дагаварыў. — З задняў пляцоўкі тралейбуса да іх набліжаўся... прафорг.

— Куды сабраліся, хлопцы? — весела спытаў ён.

— У сталоўку, — быў адказ.

— Ну-ну, ешце, ды толькі ж грошы пакідайце... на білеты, — загадкава ўсміхнуўся прафорг.

— Ды ну?! Хіба і нам на «Песняроў» на білеты пашанцавала? — з запалам выгукнуў першы.

— Нарэшце, — задаволена працягнуў другі.

— Ды што вы, хлопцы, якія «Песняры»? — здзівіўся прафорг. — Вы ж ведаеце самі: хіба ў такіх выпадках на нашу групу хапала білетаў? А вось на канцэрт опернага спевака, з поўдня, здаецца, (прозвішча я яго не ведаю), калі ласка. Білетаў ажно дваццаць пяць штук. На ўсю групу. Кожнаму, так сказаць, па шчасліваму білеціку.

Хлопцы зажурыліся.

— А можа б як-небудзь на канцэрт «Песняроў» расстараўся? — нясмела азваўся адзін з іх.

— Э, не, хлопцы, не блазнуйце, — пагрозліва памахаў пальцам прафорг. — Давайце па рублю на спевака гэтага і — справа з канцом.

Штосьці незадаволена мармычачы сабе пад нос, хлопцы неахвотна палезлі ў кішэні.

— Бяры, — з абыякавым выглядам сказаў першы.

— Эх, рублёўка ты мая..., — ледзь не прыпеўкай працягнуў другі.

— Вы мне не разважайце, — па-начальніцку заўважыў прафорг. — Білетаў я назад не нясу: не бяруць іх у прафкоме, так што хочаш, не хочаш — трэба збываць.

Тралейбус спыніўся. Развітаўшыся з аднакурснікамі, прафорг выйшаў. Хлопцы ж паехалі далей. Толькі іх цудоўны настрой быў ужо сапсаваны. Кожны думаў аб прафоргу. За час вучобы той ні разу не пацікавіўся, ці патрэбна каму са студэнтаў групы матэрыяльная дапамога. Заўсёды ў яго быў адзіны клопат: як збыць выдзеленыя на групу білеты, якія не вельмі ахвотна бралі студэнты.

Але свой абавязак ён выконваў спраўна, і ў прафкоме ім былі задаволены...

**А. ШВЕДАЎ,**
**студэнт 2-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**




# VII (КРАСАВІЦКАЯ) УСЕРАСІЙСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ РСДРП (б)

VII (Красавіцкая) Усерасійская канферэнцыя РСДРП(б), якая адбылася 24—29 красавіка (7—12 мая) 1917 года, мела гістарычнае значэнне ў падрыхтоўцы сацыялістычнай рэвалюцыі ў Расіі. Па сваіх палітычных і арганізацыйных задачах яна адыграла ролю партыйнага з'езда. Канферэнцыя аднадушна адобрыла ленінскі курс на барацьбу за пераход да другога, сацыялістычнага этапа рэвалюцыі, выкрыла і адхіліла апартуністычную лінію Каменева і іншых, прадказваючых рэвалюцыі паражэнне. Яна завяршыла з'яднанне партыі вакол ленінскіх Красавіцкіх тэзісаў.

Работай канферэнцыі кіраваў У. І. Ленін. Ён зрабіў даклады па важнейшых пытаннях палітычнай і арганізацыйнай дзейнасці партыі. Канферэнцыя прыняла ленінскія рэзалюцыі. Яна прыняла ленінскую ўстаноўку на пераход усёй улады ў рукі Саветаў, заваяванне партыяй большасці ў Саветах і ператварэнне іх у органы дыктатуры пралетарыяту. Па аграрнаму пытанню яна выставіла патрабаванні канфіскацыі памешчыцкіх зямель і перадачы іх у распараджэнне сялянскіх камітэтаў, а таксама нацыяналізацыі ўсіх зямель у краіне. Канферэнцыя адобрыла ленінскія напрамкі распрацоўкі праекта новай праграмы бальшавіцкай партыі. Пры абмеркаванні нацыянальнага пытання падтрымку атрымалі ленінскія палажэнні аб праве нацый на самавызначэнне аж да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў.

Рашэнні Красавіцкай канферэнцыі ўзброілі партыю бальшавікоў і пралетарыят Расіі канкрэтнай праграмай барацьбы за перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі. Пад лозунгамі гэтай праграмы бальшавікі рыхтавалі масы да пралетарскай рэвалюцыі. Ленінская праграма пераходных мер да сацыялізму ў Расіі з'явілася найвялікшым дасягненнем творчага марксізму, абагаціўшы тэорыю і практыку навуковага сацыялізму.

# ПРАЯВІЦЬ АРГАНІЗАВАНАСЦЬ

Заканчваецца страхаванне студэнтаў універсітэта на бягучы навучальны год.

Высокую свядомасць і арганізаванасць праявілі студэнты фізічнага (адказн. Л. М. Арлова), эканамічнага (адказн. М. Д. Бабошка), факультэтаў, факультэта фізічнага выхавання (адказн. Т. М. Мацвеева).

А вось на механіка-матэматычным факультэце назіраецца мінулагодняя карціна — страхаванне праходзіць тут не на ўзроўні. Застрахаваць сваё жыццё пакуль што пажадалі студэнты толькі адзінаццаці акадэмічных груп. Не радуюць сваёй масавасцю і студэнты астатніх факультэтаў.

Старасты груп, прафоргі і камсоргі, зрабіце ўсё ад вас залежачае, каб да канца гэтага навучальнага года застрахавалі сваё жыццё ад няшчасных выпадкаў усе студэнты. Гэта выгадна і вам, і дзяржаве.

**В. ЧАРНЫШОВА,**
**агент інспекцыі дзяржстраху.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

АЗ 04592.

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш.

Наш адрас: вул. Кірава, 119, корпус № 2, П. 4-8, т. 6-27-71. Фармат 600× 420 мм. Тыраж 2000 экз.

Заказ 3055